№9 (294)
2011

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь



# Не запалохаць, не зламаць...

Асуджаны за ўдзел у "масавых беспарадках" Мікіта Ліхавід адбывае пакараньне ў Наваполацкай калоніі. Туды яго этапавалі 7 траўня і ўжо праз два дні ён патрапіў на 10 сутак у штрафны ізалятар (ШЫЗА). Адбыўшы гэтае пакараньне, праз суткі зноў патрапіў у ШЫЗА ўжо на 15 сутак, 9 чэрвеня – яшчэ на 5 сутак, 14 чэрвеня – зноў 5 сутак, а 11 ліпеня моладзевы актывіст пяты раз трапіў у карцэр на 20 сутак. Усяго ад 7 траўня, калі ён быў этапаваны ў калонію, Мікіта Ліхавід правёў у карцэры 35 сутак...

Адвакат Дар'я Ліпкіна пасьля наведаньня свайго падабароннага Мікіты Ліхавіда распавяла, што ён вельмі худы, бледны, пад вачыма сінія кругі. Але трымаецца мужна, ні на што ня скардзіцца. Маці палітвязьня Алена Ліхавід паведаміла: "Нядаўна я размаўляла з доктарам з калоніі. Ён сказаў, што імкнецца наведваць карцэр кожны дзень, цікавіцца, ці ёсьць скаргі на здароўе. Сказаў, што Мікіта ні на што не скардзіцца. Ягоная бледнасьць і сінія кругі пад вачыма выкліканыя тым, што ён амаль не знаходзіцца на сьвежым паветры, ня бачыць сонца"... У карцэры забаронена любая перапіска, так што лістоў ад Мікіты яго маці даўно не атрымлівала.

Прычынаю зьмяшчэньня М. Ліхавіда ў ШЫЗА стала тое, што, лічачы сябе незаконна асуджаным, ён адмаўляецца падпісваць абавязацельствы аб выкананьні патрабаваньняў рэжыму і выконваць іх. Ён падымаецца зранку, выходзіць на зарадку – але стаіць. Калі ў яго пытаюцца, чаму ён стаіць і ня робіць практыкаваньні, адказвае, што пакуль з яго не здымуць абвінавачаньне, ён незаконна асуджаны і іх умовы выконваць ня будзе.

Умовы ўтрыманьня ў штрафным ізалятары не адпавядаюць мінімальным міжнародным стандартам і па сутнасьці зьяўляюцца катаваньнямі. Мужнасьць, з якой пераносіць гэтыя пакуты Мікіта Ліхавід, ня можа не зьдзіўляць і не захапляць. Ён сапраўдны герой нашага часу...

## Увага да Беларусі сталая і пільная

Праваабаронцы абмеркавалі са сьпецдакладчыкамі ААН сітуацыю ў Беларусі

**Прадстаўнікі праваабарончых арганізацыяў – Беларускага Хельсінкскага камітэту, Праваабарончага цэнтру "Вясна", Цэнтру прававой трансфармацыі, Беларускай асацыяцыі журналістаў і Камітэту абароны рэпрэсаваных "Салідарнасьць" – наведалі Упраўленьне Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека (УВКПЧ) у Жэневе.**

**Візіт адбыўся ў рамках працы па рэкамендацыях універсальнага перыядычнага агляду (УПА) па Беларусі 2010 году. Падчас візіту група была азнаёмленая з мандатам, прыярытэтамі і дзейнасьцю УВКПЧ ААН, Рады ААН па правах чалавека, а таксама дагаворных органаў і сьпецыяльных працэдураў ААН па правах чалавека.**

**Група таксама сустрэлася са сьпецыяльнымі дакладчыкамі ААН па свабодзе сходаў і асацыяцыяў, катаваньнях і праваабаронцах, і абмеркавала пытаньні, па якіх працуюць сьпецыяльныя дакладчыкі. Сьпецыяльныя дакладчыкі пацьвердзілі сваю сталую ўвагу да Беларусі, асабліва ў кантэксьце нядаўняй рэзалюцыі Рады ААН па правах чалавека па сітуацыі ў краіне.**

***Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.by***

# Акцыі мелі мірны характар...

## "Сілавыя разгоны мірных сходаў грамадзянаў падразьдзяленьнямі МУС зьяўляюцца найгрубейшым парушэньнем правоў чалавека", – гаворыцца ў Заяве Праваабарончага цэнтру "Вясна"

Падчас правядзеньня мірных сходаў у г. Менску і іншых гарадах Беларусі 22, 29 чэрвеня і 3 ліпеня 2011 г. прадстаўнікамі падразьдзяленьняў МУС у дачыненьні да мірных грамадзянаў былі ўжытыя фізічная сіла і сьпецсродкі, адбываліся масавыя затрыманьні як удзельнікаў мірных сходаў, так і выпадковых мінакоў. У выніку сотні грамадзянаў былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці, у тым ліку ў выглядзе адміністрацыйных арыштаў, па сфальсіфікаваных абвінавачаньнях ва ўчыненьні дробнага хуліганства – нецэнзурнай лаянцы ў грамадзкіх месцах. Праваабарончым цэнтрам "Вясна" фіксаваліся шматлікія факты незаконнага выкарыстання фізічнай сілы ў дачыненьні да затрыманых грамадзянаў, факты супрацьдзеяньня супрацоўнікамі МУС законнай дзейнасьці журналістаў па асьвятленьні падзеяў, а таксама факты затрыманьня праваабаронцаў, якія ажыцьцяўлялі маніторынг азначаных падзеяў.

**У сувязі з гэтым Праваабарончы цэнтр "Вясна" заўляе свой пратэст і адзначае наступнае:**

Акцыі пратэсту, якія адбыліся ў Менску і іншых гарадах Беларусі 22, 29 чэрвеня і 3 ліпеня, насілі выключна мірны характар, ніякім чынам не парушалі грамадзкі парадак, не прадстаўлялі пагрозы грамадзкай і нацыянальнай бясьпецы, правам і свабодам іншых асобаў.

Грамадзяне Беларусі маюць права мірна зьбірацца на вуліцах сваіх гарадоў для выказваньня свайго меркаваньня, у тым ліку пратэсту супраць кіраўніцтва краіны.

Свабода мірных сходаў гарантаваная грамадзянам Беларусі, як Канстытуцыяй краіны, так і міжнароднымі нормамі ў галіне правоў чалавека, арт. 21 Міжнароднага Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, ратыфікаваных Рэспублікай Беларусь, у прыватнасьці.

Мірныя сходы знаходзяцца пад аховай міжнародных нормаў у галіне правоў чалавека, нават калі такія сходы не санкцыянаваныя органамі ўлады.

Затрыманьні грамадзянаў па надуманых і непраўдзівых абвінавачаньнях у дробным хуліганстве, а затым іх асуджэньне судамі зьяўляецца нічым іншым, як адвольнымі і незаконнымі затрыманьнямі і арыштамі.

Уся адказнасьць за вышэйпералічаныя незаконныя дзеяньні, скіраваныя на парушэньне правоў чалавека, цалкам кладзецца на беларускія ўлады, кіраўніцтва і супрацоўнікаў МУС, суддзяў раённых і гарадзкіх судоў, якія маюць непасрэднае дачыненьне да адвольных затрыманьняў і арыштаў удзельнікаў мірных сходаў.

Зьбіцьцё затрыманых грамадзянаў супрацоўнікамі МУС у сьпец. транспарце, нематываванае і непрапарцыйнае ўжываньне гвалту падчас затрыманьняў зьяўляецца нічым іншым, як катаваньнямі. Варта нагадаць, што свабода ад катаваньняў носіць абсалютны характар.

**У сувязі з гэтым Праваабарончы цэнтр "Вясна" чарговы раз заклікае ўлады Беларусі:**

Неадкладна вызваліць усіх затрыманых і арыштаваных за ўдзел у мірных сходах грамадзянаў;

Выконваць узятыя на сябе міжнародныя абавязацельствы ў галіне правоў чалавека, у тым ліку ў галіне свабоды мірных сходаў;

Забясьпечыць грамадзянам краіны рэалізацыю свабоды мірных сходаў і неадкладна спыніць ганебную практыку затрыманьняў і зьбіцьця іх удзельнікаў;

Прывесьці ў адпаведнасьць міжнародным нормам заканадаўства аб парадку арганізацыі і правядзеньні масавых мерапрыемстваў, у прыватнасьці, замацаваным у кіруючых прынцыпах АБСЕ па свабодзе мірных сходаў;

Правесьці тэрміновае рассьледаваньне ўсіх фактаў перавышэньня службовых паўнамоцтваў супрацоўнікамі МУС, прыцягнуць вінаватых да ўстаноўленай законам адказнасьці.

*Праваабарончы цэнтр "Вясна",*
*4 ліпеня 2011 г.*

# Перасьледам нас не спыніць

## "Вясна" салідарная з рэгіянальнымі сябрамі-праваабаронцамі

Праваабарончы цэнтр "Вясна" заяўляе аб падтрымцы і салідарнасьці з рэгіянальнымі актывістамі, затрыманымі пры выкананьні прафесійных абавязкаў падчас акцыяў маўклівага пратэсту па ўсёй Беларусі.

Праваабаронца з Маладэчна Алесь Капуцкі быў затрыманы падчас акцыі 15 чэрвеня, у яго былі перапісаныя асабістыя дадзеныя.

Праваабаронца Уладзімір Целяпун быў затрыманы ў Мазыры 22 чэрвеня. Ён прыйшоў на гарадзкую плошчу пасьля атрыманьня інфармацыі, што там пачаўся хапун маладых людзей. Праваабаронца быў дастаўлены ў РАУС, адкуль яго адпусьцілі амаль апошнім з затрыманых – без правядзеньня адміністрацыйных працэдураў.

Аляксей Лапіцкі з Жодзіна быў затрыманы на акцыі 29 чэрвеня са складаньнем пратаколу за непадпарадкаваньне законным патрабаваньням міліцыі (арт. 23.4 КаАП РБ). На наступны дзень суд прысудзіў Аляксею Лапіцкаму 5 сутак арышту.

Гомельскі праваабаронца Анатоль Паплаўны быў затрыманы на акцыі 3 ліпеня і пакараны 15 суткамі арышту за дробнае хуліганства (арт. 17.1 КаАП РБ).

У той самы дзень у Магілёве быў затрыманы праваабаронца Барыс Бухель. У яго адабралі мабільны тэлефон і выдалілі фотаздымкі з акцыі. Яшчэ раз спадара Бухеля затрымалі 7 ліпеня, на наступны дзень пасьля чарговай акцыі. Праваабаронца зьмешчаны ў ізалятар часовага ўтрыманьня, а 8 ліпеня асуджаны на 7 сутак арышту.

ПЦ "Вясна", нягледзячы на ціск і перасьлед з боку ўладаў, і надалей будзе працягваць сваю дзейнасьць па абароне правоў і свабодаў беларускіх грамадзянаў.

*9 ліпеня 2011 г.*

## Алесь БЯЛЯЦКІ:

# "Менгарсуд павінен паставіць пытаньне аб прызнаньні артыкулу 193.1 неканстытуцыйным..."

Сваю прапанову старшыня ПЦ "Вясна" выклаў у касацыйнай скарзе на рашэньне суда Цэнтральнага раёну, які 20 чэрвеня 2011 году прызнаў вынесенае праваабаронцу афіцыйнае папярэджаньне Генеральнай пракуратуры законным.

А. Бяляцкі заяўляе ў калегію па грамадзянскіх справах Менскага гарадзкога суда, што ня згодны з такім судовым рашэньнем, паколькі лічыць яго незаконным. Праваабаронца просіць вышэйшую судовую інстанцыю адмяніць рашэньне суда Цэнтральнага раёну і ў абгрунтаваньне сваёй пазіцыі прыводзіць наступныя падставы:

"Артыкул 5 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь утрымлівае пералік абмежаваньняў свабоды асацыяцыяў. Так, у Рэспубліцы Беларусь забараняецца стварэньне і дзейнасьць палітычнах партыяў, а таксама іншых грамадзкіх аб’яднаньняў, якія маюць на мэце гвалтоўнае зьмяненьне канстытуцыйнага ладу альбо якія прапагандуюць вайну, сацыяльную, нацыянальную, рэлігійную ці расавую варажнечу. Дадзены пералік зьяўляецца закончаным і не падлеглым пашыранаму растлумачэньню.

Дапушчальныя абмежаваньні свабоды асацыяцыяў утрымліваюцца і ў арт. 22 Міжнароднага Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах. Згодна з дадзеным артыкулам Пакту, кожны чалавек мае права на свабоду асацыяцыяў з іншымі, уключаючы права ствараць прафсаюзы і ўступаць у іх для абароны сваіх інтарэсаў.

Карыстаньне дадзеным правам не падлягае ніякім абмежаваньням, акрамя тых, якія прадугледжваюцца законам і якія неабходныя ў дэмакратычным грамадзтве ў інтарэсах дзяржаўнай ці грамадзкай бясьпекі, грамадзкага парадку, аховы здароўя і маральнасьці насельніцтва ці абароны правоў і свабодаў іншых асобаў.

У вынесеным мне Генеральнай пракуратурай папярэджаньні не ўтрымліваецца спасылкі хаця б на адно з пералічаных вышэй дапушчальных абмежаваньняў".

А. Бяляцкі ўказвае на тое, што ў папярэджаньні Генпракуратуры не прыведзена ніводнага аргумента наконт таго, чаму ён ня мае права ажыцьцяўляць праваабарончую дзейнасьць ад імя Праваабарончага цэнтру "Вясна" і чым такая дзейнасьць наносіць шкоду нацыянальнай бясьпецы ці грамадзкаму парадку, правам і свабодам іншых асобаў. Паводле праваабаронцы, у судовым пасяджаньні прадстаўнік пракуратуры таксама ня здолеў указаць хаця б на адно з пералічаных вышэй дапушчальных абмежаваньняў свабоды асацыяцыяў.

Атрымліваецца, такім чынам, што ўся "віна", указаная ў папярэджаньні, зводзіцца да таго, што сп. Бяляцкі робіць заявы, каментары і выступы па розных пытаньнях грамадзка-палітычнага жыцьця краіны ад імя незарэгістраванага Праваабарончага цэнтру "Вясна".

"Суд у сваім рашэньні праігнараваў нормы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і не зрабіў прававой ацэнкі вынесенага папярэджаньня з пункту гледжаньня арт. 22 Міжнароднага Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах. У адпаведнасьці з арт. 8 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забясьпечвае адпаведнасьць ім заканадаўства. Рэспубліка Беларусь ратыфікавала Міжнародны Пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах і першы Факультатыўны пратакол да яго, добраахвотна ўзяўшы такім чынам абавязацельствы па яго выкананьні.

Згодна з арт. 21 ГПК Рэспублікі Беларусь, суд абавязаны разгледзець справу на падставе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і прынятых у адпаведнасьці з ёй нарматыўных прававых актаў.

Уся мая праваабарончая дзейнасьць і дзейнасьць Праваабарончага цэнтру "Вясна" ў цэлым ажыцьцяўляецца выключна ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і палажэньнямі Дэкларацыі аб праве і абавязку асобаў, групаў і органаў грамадзтва заахвочваць і абараняць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды (Дэкларацыя аб праваабаронцах), рэзалюцыяй 53/144 Генеральнай Асамблеі ААН ад 9 сьнежня 1998 г.


Алесь БЯЛЯЦКІ.

У сувязі з гэтым лічу, што папярэджаньне аб адказнасьці за такую дзейнасьць, як і наяўнасьць самой такой адказнасьці ў выглядзе арт. 193.1 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь (крыміналізацыі дзейнасьці незарэгістраваных грамадзкіх аб’яднаньняў) супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і парушае мае канстытуцыйныя правы", – заяўляе праваабаронца.

Старшыня ПЦ "Вясна" просіць калегію па грамадзянскіх справах Менскага гарадзкога суда паставіць пытаньне аб прызнаньні арт. 193.1 КК РБ неканстытуцыйным. Суд мае такую кампетэнцыю ў адпаведнасьці з ч. 3 арт. 21 Грамадзянска-працэсуальнага кодэксу РБ: калі пры разглядзе канкрэтнай справы суд прыйдзе да высновы аб неадпаведнасьці нарматыўнага акту Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, ён прымае рашэньне ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

# Хроніка "маўклівай рэвалюцыі"

***Усяго за час правядзеньня "маўклівых рэвалюцый", арганізаваных "Рэвалюцыяй праз сацыяльныя сеткі", што адбываліся ў Беларусі 15, 22 і 29 чэрвеня, а таксама 3, 6 і 13 ліпеня, было затрымана каля 2000 чалавек. З іх у Менску – каля 1100. Большая частка іх была пакарана арыштамі і штрафамі. Многія адпускаліся пасьля здачы адбіткаў пальцаў і папярэджаньняў. Многія былі зьбітыя. Дадзеныя не канчатковыя, паколькі сабраць поўную інфармацыю праваабаронцы магчымасьці ня маюць з-за закрытасьці судоў і адсутнасьці сьпісаў. Паводле падлікаў БАЖ, усяго з часу зьяўленьня ініцыятывы "маўклівых пратэстаў" у Менску і рэгіёнах зафіксавана ўжо 77 выпадкаў затрыманьня журналістаў. 15 чэрвеня – 9, 22 чэрвеня – 8, 29 чэрвеня – 12, 3 ліпеня – 20, 6 ліпеня – 28 затрыманых журналістаў і сяброў БАЖ...***

## *3 ліпеня*

Па дадзеных праваабаронцаў агулам 3 ліпеня ў Беларусі было затрымана каля 310 чалавек. У Менску супрацоўнікі міліцыі затрымалі больш за 160 чалавек. У іншых гарадах Беларусі былі затрыманыя 150 чалавек. Найбольш у Гомелі (30 чалавек), Гародні (80 чалавек), Магілёве (15 чалавек), Віцебску (7 чалавек),Смалявічах (6 чалавек), Баранавічах (5 чалавек), Жлобіне (2 чалавекі). Позна вечарам з РУУС сталіцы адпусьцілі непаўнагадовых, журналістаў і цяжарную жанчыну. На большасьць удзельнікаў акцыі пратэсту складзеныя пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні. Сярод затрыманых 20 журналістаў, большасьць з іх на волі.

**МЕНСК.** На Прывакзальнай плошчы Менску было затрымана каля 100 чалавек, быў ужыты сьлезацечны газ. Затрыманыя знаходзіліся ў Фрунзенскім (50 чалавек), Заводзкім (20 чалавек), Кастрычніцкім (каля 30 чалавек) і Маскоўскім (40 чалавек) РАУС. Каля 70 знаходзіліся на Акрэсьціна.

Удзень быў затрыманы журналіст Павел Сьвярдлоў. Чатыры гадзіны сувязь з ім адсутнічала. Потым Паўлу ўдалося патэлефанаваць і сказаць, што ён знаходзіцца ў Фрунзенскім РАУС і яго вязуць на Акрэсьціна. Яго адпусьцілі з Акрэсьціна пасьля 10 гадзіны вечара.

Пры затрыманьні Марыны і Улада Лобавых быў выкарыстаны сьлезацечны газ.

**ВІЦЕБСК.** Перад пачаткам акцыі былі затрыманыя Алег Сурган і Алесь Галавань. Алегу Сургану міліцыянты сказалі, што ён падобны да нейкага злачынцы, і адвялі ў апорны пункт аховы правапарадку, што на вуліцы Жасткова.

**ГОМЕЛЬ.** Каля 20 чалавек знаходзіліся ў РАУС Цэнтральнага раёну і каля 10 чалавек у Чыгуначным. Сярод затрыманых – праваабаронца Анатоль Паплаўны, карэспандэнт БелаПАН Алена Германовіч і карэспандэнт рэгіянальнага сайту "Моцныя навіны" Яўген Сувораў.

**МАГІЛЁЎ.** Месца правядзеньня "маўклівай" акцыі пратэсту, арганізаванай праз сацыяльныя сеткі ў інтэрнэце, было ачэпленае міліцыяй. Каля сотні чалавек здолела прайсьці у сквер, дзе акцыя адбывалася ў мінулыя разы. Затрыманыя праваабаронца Барыс Бухель, журналісты Алесь Асіпцоў, Ганна Ільіна. Усяго затрымана каля 15 чалавек.

**ГАРОДНЯ.** Паводле сьведкаў, затрымана 80 чалавек. Іх адвезьлі ў Гарадзенскую раённую міліцыю. Сярод затрыманых Гражына Шалкевіч, Эдуард Дмухоўскі, журналіст "Белсату" Аляксандр Дзянісаў, паэт і журналіст, сябра ПЭН-клубу Юры Гумянюк.

**СМАЛЯВІЧЫ.** Каля 19 гадзіны на цэнтральнай плошчы былі затрыманыя Уладзімір Чайчыц і ягоны паўтарагадовы ўнук Ян Чайчыц. Іх адвезьлі ў РАУС. У 22:40 былі затрыманыя Яўген Кутузаў, Яўген Саблеў, Віктар Бауман, Павел Труханові і Ягор Драгун.

**БАРАНАВІЧЫ.** У 19:20 людзі ў цывільным вывелі з купы гледачоў і затрымалі Зьмітра Кузмянкова, які глядзеў канцэрт. Разам з ім каля кінатэатру "Кастрычнік" затрымалі яшчэ трох хлапцоў. Усе яны былі дастаўленыя ў пастарунак Баранавіцкага ГАУС.

**БЕРАСЬЦЕ.** Улады перагарадзілі ўваход на плошчу з дапамогай часовай сцэны. Людзей сабралася каля 200-300 чалавек, на пляц яны прайсьці не маглі. Як паведаміў праваабаронца Уладзімір Вялічкін, многім актывістам і грамадзкім дзеячам заблакавалі мабільныя тэлефоны і таму было цяжка даведацца, дзе быў той альбо іншы чалавек.

**ЖЛОБІН.** У Жлобіне міліцыяй затрыманы кіраўнік раённай арганізацыі партыі "Справядлівы сьвет" Валер Рыбчанка і грамадзкі актывіст Алег Кастусёў.

**СЛУЦК.** Міліцыя затрымала дэмакратычнага актывіста Віталя Амяльковіча.

**БАБРУЙСК.** У Бабруйску сабралася каля 60-70 чалавек.

## *6 ліпеня*

У гарадах Беларусі затрымана больш за 400 удзельнікаў акцыяў пратэсту. У рэгіёнах – 220. У Менску – каля 190.

**МЕНСК.** У Партызанскім РАУС знаходзілася каля 20 чалавек, у Першамайскім – 20, у Фрунзенскім – 25, у Заводзкім – 30, Ленінскім – 31, Савецкім – 15, Кастрычніцкім – 20, Маскоўскім – каля 35 чалавек.

Ужо днём у Менску сьпецслужбы заблакавалі пляцоўкі для акцыяў маўклівага пратэсту ад-



Менск, 3 ліпеня 2011 году.

разу пасьля таго, як інфармацыя пра месцы збору ўдзельнікаў акцыяў пратэсту была распаўсюджаная па інтэрнэце. Гэтым разам у Менску ўдзельнікі "маўклівай рэвалюцыі" вырашылі зьбірацца каля пад'ездаў дамоў, потым ісьці да жэсаў, а адтуль у вызначаныя месцы ў кожным раёне сталіцы. Але гэта не ўратавала іх ад арыштаў.

Між тым, 6 ліпеня Генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч заявіў, што супрацоўнікі праваахоўных органаў, забясьпечваючы грамадзкі парадак, павінны карэктна ставіцца да ўдзельнікаў супрацьпраўных дзеяньняў, па магчымасьці прадстаўляцца і тлумачыць грамадзянам наступствы невыкананьня заканадаўства.

**БАБРУЙСК.** Затрыманы 23 чалавекі, якіх адвялі ў пастарунак.

**БАРЫСАЎ.** На Плошчы была затрыманая сям'я Сямёнавых (муж, жонка і двухгадовае дзіцё). Яны проста гулялі па Плошчы.

**БАРАНАВІЧЫ.** Затрымалі журналістаў газеты INTEX-PRESS: фатографа Людмілу Пракопаву і відэаапэратара Дзьмітрыя Макарэвіча. Яны мелі пры сабе пасьведчаньні і рэдакцыйныя заданьні. Усяго затрымана 12 чалавек.

**БЕРАСЬЦЕ.** На плошчы Леніна сабралася каля 200 удзельнікаў маўклівай акцыі. За 10 хвілінаў да пачатку акцыі затрыманы кіраўнік абласной арганізацыі БНФ Віктар Клімус. Усяго па дадзеных праваабаронцы Рамана Кісьляка, у Ленінскі РАУС дастаўлена шасьцёра затрыманых.

**БЯРОЗА.** На вуліцы Леніна пры падыходзе да плошчы была затрыманая карэспандэнт Радыё Рацыя Тамара Шчапёткіна. Людзі ў цывільным не прадставіліся.

**БЯРОЗАЎКА.** На гэты раз на гарадзкую плошчу выйшла 10 чалавек. Аднаго патэнцыйнага ўдзельніка акцыі затрымалі, калі той ішоў на плошчу.

**ВІЦЕБСК.** Затрымалі сяброў аргкамітэту БХД Зьмітра Пчолкіна і Усевалада Жураўлёва. На адным з форумаў жанчына піша, што яна з мужам і сябрамі была затрыманая ў 19:45 на Кастрычніцкім масьце. У РАУС яна бачыла каля 20 затрыманых удзельнікаў гуляньняў. Жанчыну адпусьцілі толькі таму, што яна была з грудным дзіцём.

**ВЯЛЕЙКА.** На падыходзе да плошчы Леніна затрымана 8 чалавек.

**ГАРОДНЯ.** У акцыі ўдзельнічала каля 300 чалавек. Адбыўся хапун. Пасьля "зачысткі" на вуліцы застаўся валяцца абутак затрыманых. Адной з затрыманых падчас маўклівай акцыі, журналістцы "Вячэрняга Гродна" Паліне Жураўлёвай стала зусім дрэнна ў пастарунку. Ёй вымушаны былі выклікаць хуткую дапамогу. Паводле словаў відавочцаў, ёй моцна дасталося, калі яе схапілі амапаўцы, яна моцна стукнулася галавой. Затрымана па розных ацэнках ад 70 да 100 чалавек.

**ГЛЫБОКАЕ.** Затрымалі 5 чалавек. Сярод іх рэдактар мясцовай незалежнай газеты "Весткі-Інфа" Зьміцер Лупач.

**ГОМЕЛЬ.** Падыходы да плошчы Леніна былі ачэпленыя, у прысутных правяралі пашпарты. Абапал плошчы Леніна гіганцкія коркі – вынік блакіроўкі галоўных магістраляў гораду. У пастарунках апынуліся сама менш тры чалавекі, у іх ліку акторка драматычнага тэатру Яся Троц.

**МАЛАДЭЧНА.** Больш за 35 затрыманых. Яны знаходзіліся ў аўтазаках. Кажуць, што затрымліваюць з прычыны таго, што побач учынена злачынства, і трэба праверыць дакументы.

**МАР'ІНА ГОРКА.** Адзін удзельнік быў затрыманы, а пасьля размовы з намесьнікам начальніка Пухавіцкага РАУС папярэджаны і вызвалены.

**НАВАПОЛАЦК.** На Плошчу ў Наваполацку прыйшло 200 чалавек. Вядома, што затрыманы Мікалай Марозаў.

**СЛУЦК.** Анатоля Балакіра, затрымалі і абвінавацілі ў непадпарадкаваньні міліцыі паводле артыкулу 23.4.КаАП РБ.

Акцыі адбыліся таксама ў Магілёве, Калінкавічах, Дзяржынску, Пінску і іншых гарадах Беларусі.

## 13 ліпеня

**МЕНСК.** Супрацоўнікі міліцыі і асобы ў цывільным разьмясьціліся каля асноўных пунктаў збору ўдзельнікаў акцыі: універсамаў "Еўрапейскі", "Рыга", "Чкалаўскі", універмагу "Беларусь", гандлёвых цэнтраў "Карона" і "Няміга". У Беларусі шматлікія правайдэры адключылі сацыяльную сетку "ВКонтакте".

**ГОМЕЛЬ.** Было затрымана як мінімум 35 чалавек, у тым ліку каля 20 раварыстаў. Быў затрыманы карэспандэнт "Камсамольскай праўды ў Беларусі" Павел Міцкевіч. Сярод затрыманых Сяргей Сьцепанец, Андрэй Цянюта і Канстанцін Жукоўскі, журналістка Ларыса Шчырыкова, Алег Маісеенка, Валянцін Палаўцоў (забрала "псіхбрыгада"...

**ЖОДЗІНА.** Як паведамляюць праваабаронцы, на Р. Васільева склалі пратакол па арт. 17.1 КаАП, абвінаваціўшы ў супраціўленьні міліцыянтам.

**ВІЦЕБСК.** Напярэдадні маўклівай акцыі пратэсту на плошчы была затрыманая кіраўніца Віцебскай моладзі БХД Настасься Сотнікава. У той самы час быў затрыманы былы прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта Уладзімір Правальскі.

**ВЯЛЕЙКА.** Затрымана сем чалавек.

**СЛУЦК.** Віталь Амяльковіч паведаміў: "Чалавек дзесяць былі затрыманыя на плошчы. Частку людзей апыталі на самой плошчы, а частку адвезьлі ў РАУС. Туды адвезьлі журналістку газеты "Інфа-Кур'ер" Тацяну Гусеву.

**ПІНСК.** Плошча Леніна перагароджаная, людзей на яе не прапускаюць. Двух чалавек затрымала міліцыя яшчэ перад акцыяй.

**САЛІГОРСК.** Маладафронтаўца Івана Шылу, затрыманага супрацоўнікамі крымінальнага вышуку ва ўнівермагу "Салігорск", абвінавацілі ў нецэнзурнай лаянцы. Затрыманы таксама Андрэй Тычына, які толькі 12 ліпеня выйшаў з салігорскага ізалятару часовага ўтрыманьня пасьля адбыцьця 13-суткавага арышту за ўдзел у маўклівай акцыі пратэсту 29 чэрвеня.

**БЕРАСЬЦЕ.** Каля свайго дому затрыманы адміністратар берасьцейскай суполкі "Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі" "ВКонтакте" няпоўнагадовы Сяргей Алексіевіч. Акцыя скончылася затрыманьнем: актывіста Аляксея Коўтуна павезьлі ў Ленінскі РАУС. У акцыі бралі ўдзел каля 150 чалавек.

**БАРАНАВІЧЫ.** Па зьвестках удзельніка акцыі Віктара Сырыцы, затрыманыя 5 чалавек, сярод іх Рыгор Макрэвіч, а таксама рабочыя баранавіцкіх прадпрыемстваў Максім Саланкевіч і Яўген Замула.

**БАБРУЙСК.** Міліцыя без тлумачэньняў затрымала журналіста Алеся Сушчэўскага.

**НАВАПОЛАЦК.** На акцыю прыйшло па розных падліках да 150 чалавек. Плошчу не перакрывалі. Праваабаронцам стала вядома пра затрыманьне супрацоўнікамі міліцыі трох чалавек, з іх вядомыя прозьвішчы толькі двух – Аляксей Трубкін і Яўген Канстанцінаў.

**МАЛАРЫТА.** Супрацоўнікі міліцыі адвялі ў РАУС трох чалавек, сярод іх праваабаронца Уладзімір Малей.

**МАЗЫР.** Як паведаміў праваабаронца Уладзімір Целяпун, пл. Леніна была цалкам блакаваная міліцыяй, у тым ліку і з аўтаматамі. 8-10 чалавек затрымалі, адвялі ў аўтобус "Ікарус".

# Нельга дапусьціць, каб "арабская вясна" перайшла ў "еўрапейскую зіму"

## У Бруселі была абмеркаваная сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі

***13 ліпеня ў Бруселі на супольным паседжаньні камітэтаў Еўразьвязу па міжнародных пытаньнях і па пытаньнях правоў чалавека ішла гаворка аб сітуацыі ў Беларусі. На паседжаньні прысутнічаў старшыня праваабарончага цэнтру "Вясна"Алесь БЯЛЯЦКІ.***

"Адразу пасьля выбараў 19 сьнежня прадстаўнікі ўлады разгарнулі вялікую кампанію рэпрэсіяў у дачыненьні да апазіцыі, праваабаронцаў і незалежнай прэсы. Перасьлед працягваецца і цяпер, але рэжым з-за міжнароднай ізаляцыі, санкцыяў і эканамічнага крызісу натыкаецца на ўсё большыя цяжкасьці, – адзначыў Алесь Бяляцкі. – Уладзе ўдаецца ня ўсё. Ёй не спрыяе і эканамічная сітуацыя, што вельмі актыўна разьвіваецца ў апошнія месяцы. У нас маштабны эканамічны крызіс, інфляцыя дасягнула 50 адсоткаў за апошнія тры месяцы. Таму цяпер улада апынаецца сам-насам не з палітычнымі актывістамі або праваабаронцамі, а з цэлымі сацыяльнымі пластамі беларускага грамадства".

Алесь Бяляцкі перакананы, што актыўнасьць людзей ня будзе спадаць, а восеньню ў Беларусі пройдуць шырокія акцыі пратэсту. "Хоць і рэжым ня дрэмле, – кажа ён. – Толькі за апошні месяц затрымалі больш за 2 тысячы ўдзельнікаў маўклівых акцыяў пратэсту".

У час, калі Эўропа захопленая падзеямі ў арабскім сьвеце, дзе, так бы мовіць, ляцяць галовы дыктатараў, у яе проста пад носам, у суседняй Беларусі, дзяржавай кіруе паліцэйска-рэпрэсіўны рэжым, сказаў францускі прафесар права і дасьледчык сітуацыі ў Беларусі пры АБСЕ Эмануэль Дэко.

"Відавочна, што нельга дапусьціць, каб "арабская вясна" перайшла ў "еўрапейскую зіму". Пры гэтым цяперашні крызіс тычыцца ня толькі Беларусі або яе вялікіх суседзяў. Ён ставіць пад сумнеў прынцыпы і абавязаньні, якія складаюць сарцавіну нашай Еўропы", – сказаў спадар Дэко.

Прафесар Эмануэль Дэко ў працэсе падрыхтоўкі дакладу з-за адмовы Беларусі супрацоўнічаць з місіяй ня змог наведаць Менск. Але ён правёў інтэнсіўныя кансультацыі ў Парыжы, Жэневе, Вене, Варшаве і Вільнюсе з міжнароднымі арганізацыямі, прадстаўнікамі дыпламатычнай супольнасьці, няўрадавых арганізацыяў і грамадзянскай супольнасьці.

"Місія па ўстанаўленьні фактаў паказвае на сур'ёзнасьць, працягласьць і маштаб грубых і сістэматычных парушэньняў правоў чалавека пасьля падзеяў 19 сьнежня. Гэта тычыцца ня толькі доўгага сьпісу асобных справаў, якія выклікаюць сур'ёзную занепакоенасьць, у тым ліку справаў "палітычных зьняволеных", але таксама сістэмы сацыяльнага кантролю за кошт запалохваньня і перасьледу, катаваньняў і шантажу, праслухоўваньня тэлефонных размоваў, ілжывых паказаньняў і прымусовых прызнаньняў, з адвольнымі і дыскрымінацыйнымі мерамі і санкцыямі ў дачыненьні да асобаў і іх сем'яў. Пад некаторымі юрыдычнымі заслонамі няма ні незалежнага правасуддзя, ні законнасьці. Беларусі неабходна выконваць свае міжнародныя абавязацельствы ў рамках АБСЕ і ААН і пагадзіцца на поўны і сталы маніторынг выкананьня правоў чалавека, які ажыцьцяўляецца незалежнымі органамі і арганізацыямі", – гаворыцца ў Рэзюмэ дакладу.

Еўрадэпутат Яцэк Пратасевіч бачыць у гэтых апошніх перасьледах і арыштах прыкметы псіхічных парушэньняў унутры беларускай улады: "У Беларусі мы назіраем рух у процілеглы бок ад дэмакратычных стандартаў. Рэакцыя ўлады нават даходзіць да абсурду і параноі. Апошнім часам людзей арыштоўваюць толькі за тое, што яны ходзяць па вуліцах. Не крычаць, не пратэстуюць, ня носяць ніякіх лозунгаў, а толькі ходзяць па публічных месцах. За гэта іх арыштоўваюць і саджаюць у турму на некалькі сутак".

Польскі парламентар заклікае не аслабляць міжнароднага ціску на рэжым Лукашэнкі, таму што толькі гэта можа дапамагчы вызваленьню і рэабілітацыі каля сотні палітычных зьняволеных. Ён прыводзіць прыклад эфектыўнасьці санкцыяў: нядаўняе вызваленьне журналіста "Газеты выборчай" Анджэя Пачобута, які прасіў дэпутата паведаміць усім, што яго "вызвалілі толькі дзякуючы ціску міжнароднай супольнасьці і пагрозе далейшага ўзмацненьня жорсткасьці санкцыяў супраць афіцыйнага Менску".

Нагадаем, што 6 красавіка 2011 году ў дачыненьні да Беларусі 14 краінамі-ўдзельніцамі АБСЕ быў ініцыяваны "Маскоўскі механізм". У рамках гэтай працэдуры сьпецдакладчыкам па Беларусі быў прызначаны прафесар міжнароднага права Парыжскага ўнівэрсітэту Эмануэль Дэко, які ў траўні пачаў працу па вывучэньні сітуацыі з правамі чалавека ў краіне. Афіцыйны Менск не прызнаў сьпецдакладчыка, і яго візіт у Беларусь не адбыўся, паколькі ён не атрымаў запрашэньня ад ураду. Нягледзячы на гэта, Эмануэль Дэко падрыхтаваў даклад па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. 16 чэрвеня Пастаянная рада АБСЕ разгледзела гэты дакумент і заклікала афіцыйны Менск выконваць свае міжнародныя абавязацельствы.

**Даведка:**

**"Маскоўскі механізм" быў прыняты АБСЕ ў 1991 годзе як комплекс мераў надзвычайнага характару для маніторынгу сітуацыі ў краіне, дзе становішча дэстабілізавана – ёсьць востры канфлікт, масавае парушэньне правоў чалавека і да т.п. АБСЕ стварае адмысловую камісію, якая назірае за сітуацыяй і дае экспертнае заключэньне, якое кладзецца ў аснову палітыкі арганізацыі ў дачыненьні да гэтай краіны. Гэта адзін з нешматлікіх інструментаў АБСЕ, рашэньне аб прымяненьні якога не патрабуе дасягненьня кансэнсусу сярод усіх краінаў-удзельніцаў; яго могуць ініцыяваць ня менш як 10 краінаў-удзельніцаў. Да дзяржавы, якая перашкаджае працы камісіі АБСЕ ці не выконвае рэкамендацыі арганізацыі, могуць быць ужытыя розная кшталту санкцыі.**

# Не пасадзілі!

## Анджэю Пачобуту далі тры гады з адтэрміноўкай і адпусьцілі ў зале суда




Анджэй ПАЧОБУТ з сям'ёй пасьля суда.

5 ліпеня ў Гародні аднавіўся працэс над журналістам "Газеты выборчай" Анджэем Пачобутам. Пракурор прапанаваў зьняволіць журналіста на тры гады.

Працэс пачаўся 14 чэрвеня і праходзіў з перапынкамі, неаднаразова перарываўся. Суд ішоў у закрытым рэжыме, у залу суда не пускалі нават жонку з дачкой і бацькоў Анджэя.

Крымінальная справа ў дачыненьні да журналіста была заведзеная 18 сакавіка за артыкулы ў польскай "Gazeta Wyborcza", на сайце "Белорусский партизан" і ў ягоным блогу. 6 красавіка Анджэй быў арыштаваны.

Пачобут сьвядома кінуў выклік КДБ. 8 студзеня журналісту выпісалі афіцыйнае папярэджаньне пра недапушчальнасьць супрацьпраўных дзеяньняў (удзел у несанкцыянаванай акцыі 19 сьнежня) за подпісам начальніка Упраўленьня КДБ па Гарадзенскай вобласьці Івана Каржа. Пачобут сьцьвярджае, што пры гэтым супрацоўнікі гарадзенскага КДБ пагражалі яму і некалькі разоў ударылі яго па галаве. Ён падаў скаргу на дзеяньні кадэбістаў у вайсковую пракуратуру. Вынікам настойлівасьці журналіста стала серыя праверак і медычных экспертызаў.

Адначасова з журналістыкай, Анджэй Пачобут займаецца і грамадзкай дзейнасьцю: ён адзін з лідараў Саюзу палякаў. Па адукацыі ж Пачобут – юрыст, а таксама займаецца вывучэньнем польскага антысавецкага руху ў Заходняй Беларусі.

Напачатку чарговага паседжаньня Анджэй Пачобут заявіў, што не прызнае ні сваёй віны, ні гэты суд. Пра гэта расказаў адвакат. Ён паведаміў, што апошняе слова Пачобута было кароткім.

У 14.30 стала вядома, што Анджэй Пачобут атрымаў тры гады з адтэрміноўкай на два гады паводле артыкулу "паклёп на прэзідэнта" і адпушчаны ў зале суда.

Анджэй пракаментаваў гэты вырак. Ён адзначыў, што не чакаў такога прысуду, а рыхтаваўся да турэмнага тэрміну. Нават сёньня раніцай ён рыхтаваўся да горшага і пачаў "задумвацца", дзе будзе адбываць тэрмін. "Чамусьці думалася пра Магілёўскую вобласьць", – кажа Анджэй. "І толькі калі падчас зачытваньня прысуду прагучала слова "адтэрміноўка", я нарэшце асэнсаваў прысуд. Лічу, што вынесены прысуд – вынік ціску на рэжым Лукашэнкі, вынік увядзеньня эканамічных санкцыяў у дачыненьні да рэжыму. Я заўсёды быў прыхільнікам таго, каб у дачыненьні да дыктатарскіх рэжымаў праводзіць цьвёрдую палітыку, бо толькі цьвёрдая пазіцыя дае вынік".

Пачобут перакананы, што сэнсам "такіх арыштаў і такіх крымінальных справаў зьяўляецца шантаж". "Безумоўна, гэта была нейкая спроба шантажу ў дачыненьні да Польшчы. Аляксандр Лукашэнка выкарыстаў мяне як інструмент ціску. Я вельмі рады, што ніякіх саступак з гэтай нагоды Лукашэнка не атрымаў", – падкрэсьліў журналіст.

Анджэй адзначыў, што не зьбіраецца пакідаць журналістыку, будзе працягваць сваю дзейнасьць, у тым ліку і грамадзкую, але пакуль хоча адпачыць. Прысуд абмяжоўвае яго ў перамяшчэньнях, але лепей такі прысуд, чым турма, сказаў Анджэй.

# "Нашу ніву" і "Народную Волю" не закрываюць

12 ліпеня ў Вышэйшым гаспадарчым судзе аднавіўся разгляд справы аб закрыцьці газеты "Наша Ніва". Пазоў аб спыненьні выпуску "Нашай Нівы" быў пададзены Мінінфармам на падставе артыкулу 51 закону "Аб сродках масавай інфармацыі" – з прычыны вынясеньня рэдакцыі на працягу году больш як двух пісьмовых папярэджаньняў. Два папярэджаньні "Наша Ніва" атрымала за публікацыі, зьвязаныя з расейскім фільмам "Хросны бацька" (пра беларускія ўлады), а трэцяе, вынесенае 14 красавіка, – у сувязі з асьвятленьнем тэракту ў менскім метро.

9 ліпеня стала вядома пра тое, што Мінінфарм вынес "Нашай Ніве" яшчэ адно папярэджаньне. Прычынай для яго паслужыла адсутнасьць падпіснога індэксу ў нумары за 1 чэрвеня 2011 году.

На судовых слуханьнях, што аднавіліся 12 чэрвеня, прадстаўнік пазоўніка нечакана адклікаў заяву аб спыненьні выпуску газеты, нічым гэта не матывуючы. Суд пад старшынствам Віктара Курылы хадайніцтва задаволіў.

Рашэньне Мінінфарма стала нечаканасьцю для супрацоўнікаў "Нашай Нівы".

"Гэта той рэдкі выпадак, калі перамог здаровы сэнс, – заявіў, каментуючы сітуацыю калегам, галоўны рэдактар выданьня Андрэй Скурко. – Думаю, сюрпрыз, выкліканы паседжаньнем, не адбыўся б, калі б улады не адчулі на сабе ціск грамадзкасьці, калі б не было шматлікіх лістоў чытачоў у Міністэрства інфармацыі з патрабаваньнем не закрываць газету. Напэўна, улады ацанілі сітуацыю і вырашылі нас не закрываць", – выказаў меркаваньне Скурко.

13 ліпеня ў Вышэйшым Гаспадарчым судзе аднавіўся разгляд справы аб закрыцьці газеты "Народная Воля". Міністэрства інфармацыі адразу выступіла з хадайніцтвам адклікаць свой пазоў супраць Народнай волі. Пасьля перапынку суддзя паведаміў, што Вярхоўны Суд задаволіў хадайніцтва Міністэрства інфармацыі. На гэтым працэс закрыты.

# "Пакаталі" на трактары...

## У Мазыры былі затрыманыя балгарскі і амерыканскі журналісты


Дзімітры КЕНАРАЎ.

29 чэрвеня ў Мазыры міліцыя затрымала двух замежнікаў, грамадзяніна Балгарыі Дзімітра Кенарава і грамадзяніна Злучаных Штатаў Амерыкі Джэйсана Мотла.

Як паведамляе ў сваім інтэрнэт-блогу пісьменьніца Марыйка Мартысевіч, адзін з іх, балгарын Дзімітры Кенараў, згубіў пашпарт у Ганцавічах. У Мазыры ён паспрабаваў узяць інтэрв'ю ў дырэктара Мазырскага аўтарамонтнага заводу. Дырэктар аўтарамонтнага заводу сказаў, што ў кабінеце размаўляць ня можа, і прапанаваў лепш пакатаць Дзімітра і яго сябра на трактары. Вывеў хлопцаў на прахадную, дзе іх і затрымалі супрацоўнікі міліцыі.

Амерыканскі пісьменьнік Джэйсан Мотла быў даволі хутка вызвалены з-пад варты пасьля ўмяшаньня консула ЗША і ўжо дэпартаваны з тэрыторыі Беларусі. Але Дзімітрый Кенараў быў пакінуты пад вартай, бо ў яго не было пашпарту, а балгарскае пасольства дагэтуль не даставіла ў Мазыр неабходныя часовыя дакументы для яго вызваленьня.

У Мазырскім РАУС 1 ліпеня а 15 гадзіне пацьвердзілі, што Кенараў знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрыманьня Мазырскага РАУС. "Ён быў затрыманы за тое, што без дакументаў знаходзіўся на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, – паведаміў дзяжурны. – Зараз мы якраз займаемся рашэньнем гэтага пытаньня, афармляем яму дакументы, каб ён мог пакінуць Беларусь".

Дзімітры Кенараў зьяўляецца незалежным журналістам з Сафіі і рэдактарам "VQR". Яго матэрыялы друкаваліся ў такіх вядомых выданьнях, як "Nation", "The Boston Review", "Etiqueta Negra". Ён навучаецца ў дактарантуры па англійскай мове ў Каліфарнійскім універсітэце, Берклі.

3 ліпеня мазырскія грамадзкія актывісты перадалі ў мясцовы ізалятар маладому балгарскаму паэту і журналісту Дзімітру Кенараву перадачу.

"Разам з актывістамі БНФ, руху "За свабоду" мы сабралі балгарскаму сядзельцу перадачу – сокі, мінеральную ваду, каўбасу, печыва, прадметы гігіены – і прыйшлі ў міліцыю. Нам у дзяжурцы адказалі, што ніякія перадачы ў выходныя ў ізалятары не прымаюць. Мы сталі пераконваць міліцыянтаў, што сёньня – афіцыйны Дзень незалежнасьці рэспублікі. Замежны грамадзянін сядзіць у ізалятары пятыя суткі, і яму ніякай увагі. Урэшце начальнік міліцыі Пётр Зыкун дазволіў перадачу", – распавёў мазырскі прадстаўнік праваабарончага цэнтру "Вясна" Уладзімір Целяпун.

Дзімітры Кенараў на другім экземпляры вопісу перадачы напісаў па-расейску, што ўсё зьмесьціва перадачы атрымаў. Пры канцы дадаў: "Дзякуй!".

У выніку акцыі падтрымкі і салідарнасьці беларускія ўлады вымушаныя былі ўрэшце адпусьціць Дзімітра Кенарава і ён пакінуў Беларусь.

# Увага: конкурс

Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе і на постсавецкай прасторы, дзе прыводзяцца ў выкананьне сьмяротныя прысуды. А права на жыцьцё зьяўляецца неад'емным правам кожнага чалавека. У 2009 годзе ў Беларусі распачалася кампанія "Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня", мэта якой – спыненьне сьмяротнай кары ў краіне і далучэньне Беларусі да агульнаеўрапейскіх каштоўнасьцяў. Улічваючы гэта, Кампанія "Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня" абвяшчае конкурс лагатыпаў.

**Умовы конкурсу:**

- Лагатып павінен быць простым і зразумелым.
- Памятайце, што лагатып будзе выкарыстоўвацца на прадукцыі розных відаў, таму ён павінен лёгка перамакетоўвацца пад любую прадукцыю.
- Лагатып можа ўтрымліваць кароткія мэсэджы. Напрыклад, "Я супраць сьмяротнага пакараньня", "Скажы НЕ сьмяротнаму пакараньню" і да т.п.
- Лагатыпы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе ў фармаце cdr (CorelDRAW).

*Калі ласка, дасылайце свае працы да 25 жніўня 2011 году на электронную скрыню*
**konkyrspakarannie@gmail.com**

У лісьце павінны быць зьмешчаныя імя і прозьвішча, кантакты і кароткая інфармацыя пра аўтара.
Пераможцы конкурсу атрымаюць прызы.
Галоўны прыз – зьнешні дыск памерам 3 Тб.
Арганізатары конкурсу пакідаюць за сабой права далейшага выкарыстаньня конкурсных працаў з указаньнем імя аўтара ў асьветніцкай і іншай дзейнасьці, скіраванай на прасоўваньне і абарону правоў чалавека.

"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц.
Наклад 299 асобнікаў. Пры передруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.